## Слова адказнай пары Супер-Рэгіёну



*Хэлена і Павел Кукаловічы*
*Адказная пара Супер-Рэгіёну*
*Польшча-Цэнтральная Еўропа*

Дарагія сужэнствы і дарагія святары – духоўныя дарадчыкі!

Ліст на пачатак новага фармацыйнага года мы пішам вам у жнівеньскія дні пасля завяршэння двух важных сустрэч для адказных, якія адбыліся падчас летняга адпачынку: Калегіума нашага Супер-Рэгіёну і сустрэчы адказных з усяго свету, якая праходзіла ў Асізі.

Мы вельмі ўдзячныя Пану Богу за абедзве падзеі. Асабліва за першую, так як яе арганізацыя вісела на валаску. Як бы тое ні было, у рэшце рэшт, яна адбылася ў гасцініцы, што не дапамагло увайсці ў духоўную прастору сустрэчы, але яна адбылася, і гэта галоўнае.

Пасля абедзвюх падзей, як мы ўжо пісалі, маем сэрцы, поўныя ўдзячнасці за супольнасць, якая, нягледзячы на ўсе недахопы асобных людзей (у тым ліку нашы ўласныя слабасці), старанна ідзе да Бога. Як гэта важна, як жа натхняльна, што можна быць у групе людзей, для якіх важная святасць. Мы не можам не прасіць Вас дбаць аб дары супольнасці ў наступным фармацыйным годзе ў вашых асноўных суполках, не забываючыся пра больш шырокія супольнасці вашага сектара, рэгіёну.

Наколькі кранальнай была пілігрымка ў Чэнстахову. Дух удзячнасці, еднасці і радасці аб’ядноўваў удзельнікаў і перадаваўся суполкам. Мы пастаянна вяртаемся да гэтых двух дзён. Гэты цудоўны час ацанілі таксама сямейныя пары з-за межаў Польшчы, з-за межаў нашага Супер-Рэгіёну. Савіна і Клаўс, адказныя за рэгіён нямецкай мовы, напісалі нам перад адлётам у Франкфурт: «*Мы сядзім у самалёце з сэрцам, напоўненым удзячнасцю. Усё, што мы перажылі, было поўнае благаславенняў. Мы паўсюль сустракалі сапраўдных хрысціян. Вы жывяце ў выдатнай краіне*». Мы ведаем, што ўсё не так добра, як вынікае з іх слоў, але тым не менш, мы не можам недаацэньваць тое, што маем.

На Міжнародным Калегіуме мы пачулі шмат слоў удзячнасці нашаму Супер-Рэгіёну, прызнаючых наш клопат аб рэалізацыі харызмату Руху на ўсіх узроўнях адказнасці. Гэтыя добрыя словы мабілізуюць нас да пастаяннага высілку ў імкненні да святасці, да таго, каб аб’яўляць свету нашага Бога любові. Гэты заклік асабліва моцна кранаў нас у Асізі. Падчас наведвання прыгожай Базылікі, дзе фрэскі Джотта захопліваюць дух, экскурсавод нагадаў нам словы, скіраваныя Езусам з крыжа да святога Францішка: «***Адбудуй мой Касцёл***». Мы ўспрынялі гэтыя словы як адрасаваныя нам. Тым больш, што мы памятаем пасланне Яна Паўла II: «***Будучыня чалавецтва ідзе праз сям'ю***», у тым ліку праз нашы сем'і, нашыя сужэнствы.

У надыходзячым фармацыйным годзе, па прапанове Міжнароднай Адказнай Экіпы, мы будзем прыкладаць намаганне, каб служыць на ўзор Марыі. Кожны з нас, кожнае сужэнства, павінны адказаць сабе на пытанне, што гэта значыць. Мы ўпэўненыя, што Тая, чый Гімн хвалы мы прамаўляем кожны дзень, будзе падтрымліваць нас у нашых намаганнях, і мы з радасцю будзем дзякаваць Богу за ўсё, што Ён робіць у нашым жыцці.

«***Велічае душа мая Пана, і ўзрадаваўся Дух мой у Богу – маім Збаўцы***».

Мы запэўніваем Вас у нашай малітоўнай сувязі з Вамі. У гэты момант мы просім вас уключыць у штодзённыя малітвы гарачы заклік аб выбары згодна з Божай воляй новай пары, адказнай за Супер-Рэгіён Польшча – Цэнтральная Еўропа, якая прыступіць да служэння з наступнага фармацыйнага года, гэта значыць з 2023/2024.

*Хэлена і Павел*